Радасць дзяцей з-за сустрэчы з клерыкамі

Аўтар: Рэдакцыя
31.01.2010 03:00



З годна са шматгадовай традыцыяй 23 студзеня 2010 г. група клерыкаў і выкладчыкаў ВДС з Гродна наведала Дом дзіцяці ў Радуні, каб дапамагчы дзеткам і адарыць іх любоўю, якую яны не могуць цалкам адчуць. Падчас сёлетняй сустрэчы клерык Ян Раманоўскі правёў катэхезу пра Божае Нараджэнне, а пазней усе паламаліся аплаткамі і разам спявалі калядныя песні. Вялікую радасць выхаванцаў выклікалі вельмі жаданыя святочныя падарункі, якія яны атрымалі ад гасцей. Пасля сустрэчы з дзецьмі клерыкі і выхавацелі нашай семінарыі наведалі мясцовы музей ксяндза-пралата Казіміра Шаняўскага, шматгадовага пробашча парафіі ў Радуні, які паўстаў, дзякуючы Ганне Штэйн, гаспадыні ксяндза Казіміра.

У той жа самы дзень клерыкі ВДС з Гродна з духоўным айцом Андрэем Радзевічам наведалі школу-інтэрнат у вёсцы Парэчча, а 26 студзеня – дзяцей-інвалідаў у вёсцы Галавічполе. Падчас сустрэчы з дзецьмі былі арганізаваны імправізаваныя канцэрты, спалучаныя з забавамі і расказамі пра Божае Нараджэнне, а затым кожны яго ўдзельнік атрымаў “салодкі” падарунак.